Падтрымай "Вясну" на PATREON

За акцыю 8 верасня Мікалаю Статкевічу дадалі яшчэ 5 сутак арышту

26.09.2017 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед



Мікалай Статкевіч

Мікалай Статкевіч асуджаны яшчэ на 5 сутак арышту за ўдзел у несанкцыянаванай акцыі 8 верасня на Кастрычніцкай плошчы Мінска.

Такое рашэнне 26 верасня прыняў суд Ленінскага раёна. То бок да 15 сутак за акцыю 3 ліпеня, якія зараз адбывае апазіцыйны палітык, дадаюцца яшчэ 5.

Акцыя праводзілася ў знак пратэсту супраць беларуска-расійскіх ваенных вучэнняў «Захад-2017» і была прымеркавана да неафіцыйнага Дню беларускай вайсковай славы.

Падчас самой акцыі ніхто з яе ўдзельнікаў затрыманы не быў. Аднак за ўдзел у ёй пазней былі асуджаныя апазіцыйны палітык **Уладзімір Някляеў** і магілёўскі актывіст **Станіслаў Паўлінковіч**. Някляеў правёў сямісуткавы арышт у Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў, адкуль вызваліўся 22 верасня, Паўлінковіча пакаралі штрафам у 460 рублёў.

На 28 верасня прызначаны суд над актывістам **Вячаславам Сіўчыкам**. Разглядаць справу будзе суд Партызанскага раёна Мінска.

У каментары БелаПАН Сіўчык адзначыў, што 4 кастрычніка ў судзе Маскоўскага раёна Мінска адбудзецца суд над актывісткай **Аленай Талстой**. Вядома, што пратаколы за ўдзел у акцыі 8 верасня таксама складзеныя на **Яўгена Афнагеля**, **Алеся Макава**, **Паўла Севярынца**, **Ніну Багінскую**.

Твитнуть





"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"




#ВолюВясне


ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брэсце і Віцебску пасля рэйда па санстках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023


ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY